## № 82. Ганьне Бабарэцы

*8 студзеня 1935 г.*

Любая Анечка!

Сёньня ў нас навіна. Адданы загад па крайгорту наконт таго, што наш межрайгорт цалком пераходзіць у гандлёвы аддзел крайгорта. Гэта бухгальтарскі апарат, а ўпраўляючы назначаны начальнікам плянавага аддзелу. Глаўбухам гандлёвага аддзелу назначан нехта Шылаў — новы чалавек, а наш Булда застаецца радавым ці мо’ куды іначай атрымае назначэньне, яшчэ не вядома. Наконт ставак яшчэ няма загаду. Будзем канчаць гадавую справаздачу яшчэ мы. Заўтра пераяжджаем у другі будынак, хадзіць будзе мне бліжэй. Дык вось, як бачыш, я ўжо буду працаваць у новай установе, хоць і ня ведаю, якія яшчэ будуць умовы. Радзівон[аў] паехаў недзе, дык лягчэй працуецца. Ну, як ты даехала?

Цалую моцна. Пацалуй ад мяне Лорачку і Лялячку.

Твой *Адзік*.

## № 83. Алесі Бабарэцы

*9 студзеня 1935 г.*

Любая Лялечка!

Твой ліст мне мама перадала. Мяне ён вельмі парадаваў. Ты маладзец, што зацікавілася кніжкамі. Я ўжо, як будзе вольны час, пашукаю табе тут цікавую кніжку. Мне мама расказвала, як ты з Лораю рыхтаваліся мяне сустракаць. Вельмі Вы слаўныя ў мяне дзеткі! Як калі прыеду, ну тады мы з Вамі ўжо і пагуляем. Якія ты цяпер песьні сьпяваеш, якія вершы расказваеш? Ты мне напішы, Ляля.

Цалую цябе моцненька. Перадай маме ад мяне бусюньку.

Твой *бацік*.

Прывітаньне табе ад дзядзі Антося.

## № 84. Элеаноры Бабарэцы

*9 студзеня 1935 г.*

Дарагая Лорачка!

Я вельмі рад, што ты добра вучышся. Мама мне многа расказвала пра цябе, якая ты харошая і слаўная ў нас дзяўчынка. Мяне гэта вельмі цешыць.

Ці–ж спадабаўся табе Рабінзон? Ці ўсё было зразумела ў ім? Што ты цяпер чытаеш? Ці ходзіш у бібліятэку?

Я табе зьбіраюся тут пералажыць з нямецкае мовы цікавую казачку і прыслаць табе.

Ці ходзіць да цябе Нагасюма? І напішы таксама, ці прынялі цябе ў піянэры?

Цалую цябе моцненька. Пацалуй ад мяне Мамуську.

Твой *тата*.